3. Российский государственный исторический архив. – Ф.806. Оп. 5. Д. 10140. Ч. 2.

4. Всероссийский съезд военного и морского духовенства // Церковно-общественная мысль: прогрессивный орган военного и морского духовенства. – 1917. – №1. – С. 34–39.

5. Старостенко, Э. В. Священники белорусских епархий в рядах военного духовенства Российской империи в годы Первой мировой войны / Э. В. Старостенко // Религия и общество – 10: сборник научных статей / под общ. ред. В. В. Старостенко, О. В. Дьяченко. – Могилев : МГУ имени А.А. Кулешова, 2016. – С. 82–85.

І.Г. Гушчынскі (Мінск, Беларусь)
УА "БДПУ імя М. Танка"

## З ГІСТОРЫІ СУДОВЫХ УСТАНОЎ МАГІЛЁВА Ў ПЕРЫЯД ПОЛЬСКАЙ І НЯМЕЦКАЙ АКУПАЦЫІ 1918 Г.

Репозиторий БГПУ

Вывучэнне гісторыі судовых органаў выклікае значную цікавасць у гісторыкаў. Гэта дазваляе ў больш поўнай ступені рэканструяваць гістарычную рэчаіснасць адпаведнай эпохі, бо суды заўсёды займалі важнае месца ў жыцці грамадства. З аднаго боку, у іх уладкаванні і дзейнасці знаходзілі адлюстраванне палітычныя і сацыяльна-эканамічныя працэсы, а з іншага – ад самаго правасуддзя залежала функцыянаванне грамадскіх механізмаў.

У перыяд рэвалюцыйных узрушэнняў, неаднаразовай змены ўлады і акупацыі 1917–1918 гг. судовыя органы на тэрыторыі Беларусі, у тым ліку ў Магілёўскай губерні, аказаліся ў вельмі цяжкіх умовах. Пры Часовым урадзе рабіліся спешныя спробы рэфармаваць правасуддзе (увядзенне выбарных міравых суддзяў, адміністрацыйнай юстыцыі і інш.). Бальшавікі пасля ўзяцця ўлады ў канцы 1917 г. увогуле скасавалі існуючую судовую сістэму. Вясной–восенню 1918 г., калі ў Магілёве быў устаноўлены спачатку польскі, а затым нямецкі акупацыйны рэжым, дзейнасць былых судоў была адноўлена. Аднак працаваць яны вымушаны былі ва ўмовах падпарадкавання акупацыйным уладам і крайне цяжкага матэрыяльнага становішча.

Сёння на падставе наяўнай базы крыніц у поўнай ступені рэканструяваць гісторыю судовых органаў Магілёўскай губерні ў перыяд польскай і нямецкай акупацыі 1918 г. практычна немагчыма. Асноўны масіў архіўных дакументаў судовых органаў губерні, на жаль, страчаны. Аднак у сувязі з тым, што летам 1918 г. па рашэнні нямецкіх улад Магілёўскі акруговы суд увайшоў у склад Мінскага акруговага суда, архіўныя фонды якога ў асноўным захаваліся, сёння мы можам узнавіць некаторыя аспекты яго дзейнасці летам-восенню 1918 г.

У сакавіку 1918 г. Магілёў быў заняты вайсковымі часткамі польскага корпуса на чале з І. Доўбар-Мусніцкім. Новай уладай аднаўлялася дзейнасць былых устаноў (якія існавалі да кастрычніка 1917 г.), у тым ліку – Магілёўс-

кага акруговага суда [1, арк. 38]. Выдаткі на іх утрыманне павінны былі пакрывацца, натуральна, за кошт мясцовых сродкаў. У сувязі з гэтым 20 мая акупацыйнай адміністрацыяй было прынята рашэнне аб павелічэнні судовых пошлін для грамадзянскіх спраў: у міравых судах – з 2-х да 3-х капеек з кожнага рубля сумы іска, у акруговым судзе – з 2-х да 4-х [2, арк. 56].

У канцы мая 1918 г. Магілёў перайшоў пад кантроль кайзераўскіх войск. Адпаведна, рашэнні адносна кіравання дадзенай тэрыторыяй прымалі германскія акупацыйныя ўлады. 26 чэрвеня 1918 г. камандаваннем 10-й нямецкай арміі была выдадзена пастанова аб арганізацыі сістэмы судовых устаноў на акупаванай тэрыторыі. У адпаведнасці з ёй Магілёўскі акруговы суд ператвараўся ў пастаяннае аддзяленне Мінскага акруговага суда, пад юрысдыкцыю якога падпадала тэрыторыя, занятая 10-й арміяй [3, арк. 1]. Магілёўскаму аддзяленню была падсудна тая яе частка, якая раней адносілася да Магілёўскага акруговага суда. Яно структурна складалася з крымінальнага і грамадзянскага аддзяленняў. Узначаліў Магілёўскае аддзяленне Мікалай Саульскі (былы таварыш старшыні Магілёўскага акруговага суда), пасада якога называлася камісар-таварыш старшыні Мінскага акруговага суда [3, арк. 2].

30 чэрвеня 1918 г. адбылося пасяджэнне Агульнага схода аддзяленняў Магілёўскага акруговага суда. На ім быў заслуханы тэкст загада камандуючага 10-й нямецкай арміяй Э. фон Фалькенгайна, згодна якому акупаваная германскімі войскамі частка тэрыторыі Магілёўскай губерні павінна была ўвайсці ў склад акругі Мінскага акруговага суда. Адпаведна, Магілёўскі акруговы суд як самастойная ўстанова скасоўваўся. Яго кіраўніцтва, натуральна, было не задаволена дадзеным рашэннем. Агульны сход аддзяленняў Магілёўскага акруговага суда звярнуўся да нямецкага камандавання з хадайніцтвам аб неабходнасці захавання самастойнага акруговага суда ў Магілёве, хаця б у скарочаным складзе [2, арк. 2–3]. Аднак задаволена яно не было.

У адпаведнасці з пастановай Э. фон. Фалькенгайна ад 12 ліпеня 1918 г. вызначаўся папярэдні асабовы склад Мінскага акруговага суда. Некаторыя чыноўнікі былога Магілёўскага акруговага суда павінны былі быць пераведзены на службу ў Мінск, у тым ліку на больш высокія пасады [3, арк. 1–3]. Аднак нягледзячы на тое, што выдаткі на пераезд кампенсаваліся, магілёўскія чыноўнікі не пагаджаліся на перавод і звярталіся да акупацыйнай адміністрацыі з просьбамі пакінуць іх у Магілёве [4, арк. 12–14, 27]. Напрыклад, В. Катовіч адмовіўся ад пасады старшыні апеляцыйнага аддзялення Мінскага акруговага суда і застаўся ў Магілёве членам суда [2, арк. 25]. У верасні 1918 г. пры Мінскім акруговым судзе быў створаны савет прысяжных павераных, у склад якога павінны былі ўвайсці і адвакаты былога Магілёўскага акруговага суда. Аднак тыя гэта ігнаравалі [4, арк. 139–140], мяркуючы па ўсім, з-за нежадання падпарадкоўвацца структуры з цэнтрам у Мінску.

Пераўтвораны на падставе пастановы ад 26 чэрвеня 1918 г. суд пачаў функцыянаваць са жніўня 1918 г. На 9 жніўня пастаяннаму аддзяленню Мінскага акруговага суда ў Магілёве былі падсудны Аршанскі, Магілёўскі,



Репозиторий БГПУ

Быхаўскі, Рагачоўскі паветы Магілёўскай губерні, а таксама Сенненскі Віцебскай [5, арк. 25].

Значная колькасць спраў, якія падлягалі разгляду ў Магілёўскім аддзяленнем Мінскага акруговага суда, узнікла на тэрыторыі, занятай бальшавікамі і непадкантрольнай нямецкім войскам. Адпаведна, паўстала пытанне аб іх падсуднасці. Было прынята рашэнне не разглядаць такія справы. Пры гэтым было адзначана, што судовая ўлада, якой трэба было б іх перадаць, невядомая [2, арк. 40 – 40 адв.].

Паводле распараджэння камандуючага 10-й нямецкай арміяй Э. фон Фалькенгайна ад 5 ліпеня 1918 г. на акупаванай тэрыторыі павінны былі спаганяцца ўсе ўсталяваныя законам дзяржаўныя і земскія зборы і пошліны, якія мелі месца да ўзяцця ўлады бальшавікамі. З гэтых сродкаў і пакрываліся выдаткі на кіраванне краем і ўтрыманне ўстаноў, у тым ліку судовых. Прычым падкрэслівалася, што чыноўнікі, дзейнасць якіх дазволена германскімі ўладамі, "працуюць толькі ў інтарэсах краю" [5, арк. 41]. Што датычыць судовых пошлін, то былі захаваны іх памеры, усталяваныя раней польскімі ўладамі. Улічваючы надзвычай цяжкае матэрыяльнае становішча пераважнай большасці насельніцтва, гэта значна ўскладняла даступнасць правасуддзя. У сувязі з гэтым кіраўнік Магілёўскага аддзялення Мінскага акруговага суда М. Саульскі звяртаўся да акупацыйнай адміністрацыі зменшыць суму пошліны з 4-х да 1-й капейкі з 1 рубля іска [2, арк. 56–56адв.]. Аднак, мяркуючы па ўсім, дадзеная прапанова не была задаволена.

Матэрыяльнае становішча супрацоўнікаў судовых устаноў на акупаванай тэрыторыі было ў гэты час вельмі цяжкім. Зразумела, ва ўмовах вайны і акупацыі яно іншым і не магло быць. Аднак памер іх заробкаў быў шмат меншы, чым у служачых іншых устаноў (прыкладна ў 2 разы). Такая сітуацыя склалася з-за таго, што бальшавікі пасля ўзяцця ўлады пакінулі на службе значную частку папярэдняга адміністрацыйнага апарату, а суд скасавалі "з-за сваіх фантазій" (так гэты іх крок тлумачыў старшыня Мінскага акруговага суда Я.Я. Шындлер). Такім чынам павышэнне намінальных заробкаў, якое адбывалася ўзімку 1917–1918 гг. не магло датычыць чыноў судовага ведамства. Адпаведна, на момант узнаўлення дзейнасці судовых органаў акупацыйнымі ўладамі ўтварылася істотная розніца ў памеры аплаты працы персаналу судоў і іншых устаноў [6, арк. 1–3]. Служачыя канцылярыі Магілёўскага аддзялення Мінскага акруговага суда звярталіся да старшыні суда з просьбай (яе можна прыкладна датаваць канцом жніўня – пачаткам верасня 1918 г.) хадайнічаць перад акупацыйнымі ўладамі аб павелічэнні заробкаў да ўзроўню персаналу іншых устаноў Магілёва. У звароце гаварылася: "Болезнь души за судьбу наших голодающих детей малюток и систематическое недоедание наше убивают духовную и физическую нашу трудоспособность". Дадзеную просьбу падпісалі судовыя прыставы, сакратар суда, памочнікі сакратара і інш. (усяго 10 чалавек) [2, арк. 75]. Незадаволеныя ўмовамі працы кур'еры суда ўвогуле адмаўляліся выконваць свае абавязкі, кажучы, што не маюць намеру гэта рабіць дарма [2, арк. 87].



Репозиторий БГПУ

У пачатку верасня 1918 г. М. Саульскі, які ўзначальваў Магілёўскае аддзяленне Мінскага акруговага суда, у перапісцы са старшынёй суда Я. Шындлерам таксама звяртаў увагу таго на крайне бядотнае становішча персаналу суда [2, арк. 74]. Акрамя таго, ён казаў аб у цэлым надзвычай цяжкіх умовах, у якіх дзейнічала падначаленая яму ўстанова: недастатковы штат суда, адсутнасць сродкаў на канцылярскія прылады (чарніла, паперу і інш.), нарыхтоўку дроў, аплату рознага роду прац у памяшканнях і г. д. [2, арк. 83–84].

Напярэдадні адступлення нямецкіх вайсковых частак з Магілёва, якое адбылося ў кастрычніку 1918 г., было прынята рашэнне аб эвакуацыі Магілёўскага аддзялення Мінскага акруговага суда, у тым ліку яго служачых, у Мінск. Эвакуіравацца (прычым разам з сем'ямі) пагадзіліся 30 чыноўнікаў, пачынаючы ад камісар-таварыша старшыні суда М. Саульскага і заканчваючы дапаможным персаналам (кур'ерамі і інш.) [2, арк. 92–93]. Гэта было звязана, па-першае, з тым, што пры бальшавіках, якія скасоўвалі былыя судовыя ўстановы, гэтыя людзі рызыкавалі застацца без працы і, адпаведна, сродкаў да існавання, па-другое, некаторыя з іх, верагодна, апасаліся праследу з боку новых улад.

З заняццем у канцы кастрычніка 1918 г. Магілёва бальшавіцкімі часткамі папярэднія судовыя ўстановы спынялі сваё існаванне, а функцыі правасуддзя пераходзілі да органаў суда і кіравання, створаных новымі ўладамі.

**Спіс літаратуры і крыніц:**

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 193. Воп. 4. Спр. 29.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 183. Воп. 1. Спр. 508.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 183. Воп. 1. Спр. 1418.
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 183. Воп. 1. Спр. 513.
5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 183. Воп. 1. Спр. 407.
6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 183. Воп. 1. Спр. 505.

Репозиторий БГПУ